*паштамта*, Рэсп. Палаца культуры прафсаюзаў, *Беларускага дзяржаўнага цырка*, б. Мінскага царкоўна-археал. музея, гасцініцы «Мінск» (1957, архіт. Г.Баданаў; 1967, архіт. Р.Сысоеў, С.Мусінскі, Д.Кудраўцаў; 2002, рэканструкцыя). Ад вул. Я.Купалы праспект спускаецца да поймы р. Свіслач і ўзвышаецца над масівамі парку імя Я.Купалы і Цэнтр. дзіцячага парку імя М.Горкага. Завяршаецца першы ўчастак пл. Перамогі з *Манументам Перамогі*. Другі ўчастак ад пл. Перамогі да пл. Калініна забудаваны жылымі дамамі (1952—58, архіт М.Баршч, А.Арнаускас, А.Духан, Н.Макляцова і інш.). Тут знаходзяцца пл. Я.Коласа з помнікам Я.Коласу (1972, скульпт. З.Азгур, архіт. Ю.Градаў, Р.Заборскі, Л.Левін); комплексы 1-й клінічнай бальніцы, *Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі* і будынак Бел. нац. тэхн. ўн-та, кінатэатр «Кастрычнік», жылыя дамы з магазінам «1000 дробязей». Завяршае ўчастак пл. Калініна з помнікам М.І.Калініну (1978, скульпт. В.Палійчук, І.Глебаў, архіт. Ю.Грыгор'еў, А.Няўзораў). Трэці ўчастак ад пл. Калініна да ўезда ў горад з боку Маскоўскай шашы адметны аднабаковай забудовай. Тут знаходзяцца будынкі гадзіннікавага з-да «Прамень» (1956—61, архіт. С.Баткоўскі, І.Боўт, Н.Шпігельман), квартал жылых дамоў, Бел. аграрны тэхн. ўн-т (1956, архіт. М.Бакланаў). Да праспекта прылягаюць парк імя Чалюскінцаў, тэр. дзіцячай чыгункі (вакзал пабудаваны ў 1956), *Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»*, будынак Мінскай гідраметэаралагічнай абсерваторыі, *Нацыянальная бібліятэка Беларусі*. Уздоўж праспекта пабудавана 1-я лінія Мінскага метрапалітэна.

**НЕЙРАЛІНГВІСТЫКА**, навука, якая склалася на стыку псіхалогіі, неўралогіі і мовазнаўства і вывучае мазгавыя механізмы маўленчай дзейнасці, а таксама змяненні ў маўленчых працэсах, што ўзнікаюць пры лакальных паражэннях галаўнога мозгу. Першыя даследаванні ў галіне Н. адносяцца да канца 19 ст., калі на падставе неўралагічных і паталога-анатамічных дадзеных і лінгв. апісання парушэнняў маўлення былі створаны першыя класіфікацыі афазій (парушэнняў маўлення пры лакальных пашкоджаннях мозгу). Станаўленне Н. звязана з развіццём нейрапсіхалогіі, з аднаго боку, і развіццём функцыянальнай і генератыўнай лінгвістыкі і псіхалінгвістыкі — з другога. Тэарэтычнай асновай для ўзнікнення Н. сталі даследаванні І.А.Бадуэна дэ Куртэнэ, Л.С.Выгоцкага, І.М.Сечанава, М.С.Трубяцкога, Л.У.Шчэрбы, Р.В.Якабсона і інш. Феномен мовы ў Н. разумееецца як складанае спалучэнне матэрыяльнага і духоўнага, біял. і псіхал., сац. і індывід., што вызначае шырокія сувязі Н. з інш. навукамі: лінгвістыкай, псіхалогіяй, нейрафізіялогіяй, нейрапсіхалогіяй, нейрафізіялогіяй, нейрахірургіяй, лагапедыяй, біяфізікай і біяхіміяй, малекулярнай біялогіяй, кібернетыкай і тэорыяй інфармацыйных сістэм і інш. Шматлікія даследаванні ў Н. праводзяцца з прыцягненнем тэорый, прынятых у мовазнаўстве і псіхалінгвістыцы: мовазнаўцы распрацоўваюць тэорыі структуры мовы і арганізацыі моўнай інфармацыі, псіхалінгвісты прапануюць мадэлі і алгарытмы апрацоўкі моўнай інфармацыі ў мозгу, а нейралінгвісты аналізуюць мазгавую актыўнасць, каб высветліць, як біял. структуры (нейронныя папуляцыі і нейронныя сеткі) рэалізуюць гэтыя псіхалінгв. алгарытмы апрацоўкі. Найважнейшыя пытанні Н.: дзе ў мозгу апрацоўваецца моўная інфармацыя, як апрацоўка моўнай інфармацыі змяняецца ў часе, як структуры мозгу суадносяцца з засваеннем і вывучэннем мовы, які ўклад можа зрабіць нейрапсіхалогія ў даследаванні моўных паталогій і інш. Асн. метады Н.: метад назірання за маўленчымі паводзінамі чалавека, розныя метады даследавання мозгу з дапамогай рэнтгенакантраснага рэчыва, стэрэатаксічны метад (увядзенне мікрапрылад строга ў зададзеныя структуры мозгу з лячэбнымі і дыягнастычнымі мэтамі), электрастымуляцыя пэўных участкаў мозгу, дыхатычнае праслухоўванне (аднačасовая двухканальная рэцэпцыя розных двухканальных стымулаў) і інш.

*Літ.*: Седов К.Ф. Нейропсихолингвистика. М., 2007; Гируцкий А.А., Гируцкий И.А. Нейролингвистика. Минск, 2010; Ахутина Т.В. Порождение речи: нейролнngвистический анализ синтаксиса. 4-е изд. М., 2012.

*Д.В.Дзяц*

**НЕЙТРАЛЬНАЯ ЛЕ́КСІКА**, міжстылявая лексіка, агульнаўжывальная лексіка, якая не звязана з пэўнымі функцыянальнымі разнавіднасцямі (стылямі) мовы і не мае экспрэсіўнай афарбоўкі. У сінанімічным радзе Н.л. з'яўляецца яго сэнсавай (семантычнай) дамінантай, вакол якой выбудоўваецца парадыгма «шкалы экспрэсіўнасці» і функцыянальна-стыліст. дыферэнцыяцыі лексікі. Выразнай мяжы паміж Н.л. і лексікай, стылістычна замацаванай і экспрэсіўна афарбаванай, няма. Некаторыя шматзначныя словы ў адных значэннях выступаюць як міжстылявыя, нейтральныя, а ў інш. — як замацаваныя за пэўнымі стылямі або экспрэсіўна афарбаваныя. Так, слова «ўтрымаць» у значэнні «не аддаць частку чаго-небудзь пры выплаце» з'яўляецца словам афіцыйнa-дзелавога стылю, а ў інш. значэннях яно нейтральнае. Слова «пэцкаць» у значэнні «забруджваць, вымазваць» адносіцца да Н.л., а ў значэнні «рабіць брудна, няўмела» набывае выразную экспрэсіўную афарбоўку. Спецыфічная для таго ці інш. стылю лексіка ў межах гэтага стылю пазбаўлена эматыўнай афарбоўкі, асаблівай выразнасці, г.зн. нейтральная, і толькі ўжытая ў інш. функцыянальных разнавіднасцях мовы або неўласцівых для яе маўленчых сітуацыях, становіцца стылістычна і экспрэсіўна афарбаванай. Н.л. складае асн. частку (каля 75%) слоўнікавага складу мовы. Ёй уласціва ўскладненая